Кабінет Міністраў
Рэспублікі Беларусь

ПАСТАНОВА

10 красавіка 1996 г. N 251

г.Мінск

# АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ ЗАПАВЕДНІКУ "НЯСВІЖ"

===

Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб Нацыянальным гісторыка-культурным запаведніку "Нясвіж".

Прэм'ер-міністр
Рэспублікі Беларусь М.Чыгір

ЗАЦВЕРДЖАНА

пастановай Кабінета Міністраў
Рэспублікі Беларусь

ад 10 красавіка 1996 г. N 251

## ПАЛАЖЭННЕ

аб Нацыянальным гісторыка-культурным
запаведніку "Нясвіж"

1. Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік "Нясвіж" (далей - запаведнік "Нясвіж") прадстаўляе сабой комплекс помнікаў гісторыі, археалогіі, архітэктуры, якія маюць навуковую, гістарычную, мастацкую і культурную каштоўнасць:

палацава-паркавы ансамбль XVI - XVIII стагоддзяў;
комплекс манастыра езуітаў XVI - XVII стагоддзяў;
плябанія XVII стагоддзя;
фарны касцёл XVI стагоддзя;
парк "Альба" XVII стагоддзя;
ансамбль ратушы з гандлёвымі радамі XVI - XVII стагоддзяў;
комплекс манастыра бенедыкцінак XVI стагоддзя;
дом на рынку (дом рамесніка) XVIII стагоддзя;
гарадская (Слуцкая) брама другой паловы XVI стагоддзя;

дом N 19 па вуліцы імя Леніна.

2. Запаведнік "Нясвіж" падпарадкоўваецца Міністэрству культуры і ў сваёй дзейнасці кіруецца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", іншымі актамі заканадаўства, дададзеным Палажэннем.

3. Галоўнымі задачамі запаведніка "Нясвіж" з'яўляюцца:
выяўленне, вывучэнне, ахова і захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей;
папулярызацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей праз музеефікацыю помнікаў архітэктуры;
удасканальванне навукова-даследчай працы па вывучэнню музейных калекцый і іх каталагізацыі;

4. Запаведнік "Нясвіж" у адпаведнасці з ускладзенымі на яго галоўнымі задачамі:
ажыццяўляе супрацоўніцтва з адпаведнымі навуковымі, навукова-даследчымі ўстановамі, арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, а таксама з замежнымі і міжнароднымі арганізацыямі;
арганізуе і праводзіць работу па вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны г.Нясвіжа, а таксама прымае меры па захаванню гэтай спадчыны;
распаўсюджвае новыя веды аб гісторыі, архітэктуры, мастацтве, літаратуры і культуры г.Нясвіжа, яго наваколля, Беларусі праз стварэнне экспазіцый і выставак з выкарастаннем сабранай і навукова апрацаванай музейнай калекцыі і правядзенне музейных мерапрыемстваў з аглядам помнікаў архітэктуры і прыроды;
арганізуе правядзенне выставак, у тым ліку з прыватных калекцый;
забяспечвае ахову гісторыка-культурных каштоўнасцей;
забяспечвае знаёмства грамадзян з гісторыка-культурным комплексам, умовы і рэжым наведвання якога вызначаюцца запаведнікам.

5. Запаведнік "Нясвіж" мае правы:
займацца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, выдавецкай дзейнасцю;
стварацць спецыялізаваныя майстэрні і лабараторыі, дзейнасць якіх накіравана на захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей;
здаваць у парадку, устаноўленым заканадаўствам, у арэнду юрырычным ці фізічным асобам маёмасць, у тым ліку тую, якая мае гісторыка-культурную каштоўнасць;
набываць творы мастацтва;
займацца іншай у адпаведнасці з заканадаўствам дзейнасцю, якая не супярэчыць задачам запаведніка.

6. Запаведнік "Нясвіж" прадстаўляе навуковую канцэпцыю свайго развіцця і дзейнасці, якая зацвярджаецца Міністэрствам культуры, і на яе падставе самастойна распрацоўвае гадавыя планы эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

7. Землі, якія знаходзяцца на тэрыторыі запаведніка "Нясвіж", перадаюцца яму і выводзяцца з сельскага або іншага гаспадарчага карыстання ў парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам.

8. У мэтах забеспячэння аховы навакольнага асяроддзя матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей на тэрыторыі запаведніка "Нясвіж" устанаўліваюцца ахоўная зона, зоны рэгулюемай забудовы, аховы прыроднага наваколля, аховы культурнага слоя, праекты якіх распрацоўваюцца запаведнікам і зацвярджаюцца Дзяржаўнай інспекцыяй Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэжым утрымання зон аховы, зацверджаных у складзе праектаў, абавязковы для выканання ўсімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі.

9. Запаведнік "Нясвіж" фінансуецца за кошт сродкаў, атрыманых:

з рэспубліканскага бюджэту;

ад навуковай, выдавецкай, культурнай і іншай дзейнасці, якая не супярэчыць задачам запаведніка;

у парадку добраахвотных узносаў;

у іншым парадку, які не супярэчыць заканадаўству.

10. Пры запаведніку "Нясвіж" ствараюцца і дзейнічаюць фондава-закупачная камісія, навуковая і навукова-рэстаўрацыйная рады, якія працуюць на падставе палажэнняў, зацверджаных запаведнікам.

11. Запаведнік "Нясвіж" узначальвае дырэктар, які назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Міністэрствам культуры.

12. Дырэктар запаведніка "Нясвіж":

ажыццяўляе кіраўніцтва дзейнасцю запаведніка і насе персанальную адказнасць за выкананне ўскладзеных на запаведнік задач;

назначае на пасады і вызваляе ад пасад работнікаў запаведніка;

размяркоўвае абавязкі паміж сваімі намеснікамі, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў;

выдае загады і дае ўказанні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі запаведніка;

прадстаўляе запаведнік у адносінах з прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі;

у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам распараджаецца маёмасцю і сродкамі запаведніка, заключае пагадненні, выдае даверанасці, адкрывае ў банку разліковыя і іншыя рахункі;

зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях запаведніка;

ва ўстаноўленыя тэрміны прадстаўляе ў Міністэрства культуры неабходную планавую і справаздачную дакументацыю;

зацвярджае структуру запаведніка і штатны расклад у межах выдзеленых фінансавых сродкаў.

13. Асобы, якія парушылі рэжым утрымання запаведніка "Нясвіж" і прычынілі шкоду яго нерухомым або рухомым гісторыка-культурным каштоўнасцям, прыцягваюцца да адказнасці ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

14. Рэарганізацыя або ліквідацыя запаведніка "Нясвіж" праводзіцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

15. Запаведнік "Нясвіж" з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваім найменнем.